Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(51), Ч1, 2008

*УДК 372.016:821.161*11*

# Вывучэнне прозы В. Быкава і Ф. Дастаеўскага як крыніцы духоўнасці і гуманізму ў сярэдняй школе

Т. М. Пучынская

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Развіццё эстэтычнай культуры вучняў, фарміраванне асобы на аснове агульначалавечых каштоўнасцей, высокіх маральных пачуццяў – важнейшая задача літаратурнай адукацыі. У старэйшых класах гэтаму ў значнай ступені спрыяе вывучэнне аналітыка-рэалістычнай прозы, якая валодае найбагацейшым інтэлектуальным патэнцыялам, з'яўляецца крыніцай духоўнасці і гуманізму.

Маючы на ўвазе неабходнасць вывучэння беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай [5, с. 40-53], паспрабуем высветліць і абгрунтаваць некаторыя магчымыя шляхі вывучэння ў XI класе творчасці В. Быкава і Ф. Дастаеўскага як узораў аналітыка-рэалістычнага пісьма. Паколькі канцэптуальнае, цэласнае разуменне старшакласнікамі празаічных твораў у многім залежыць ад ацэнкі творчага метаду, якім карыстаўся пісьменнік, у якасці тэарэтычнага фону выкарыстаем аналіз традыцый аналітычнай прозы з акцэнтам на прынцыпах рэалістычнай аповесці, рамана (праламленне творчага метаду ў жанры). Выхаваўчы, праблемны аспект навучання суаднясём з мастацкай канцэпцыяй асобы і свету ў вывучаемых творах, актуальнымі маральна-гуманістычнымі праблемамі.

Пры вывучэнні манаграфічнай тэмы "Творчасць В. Быкава" на ўступных занятках мэтазгодна, каб настаўнік выкарыстаў форму лекцыі. Спачатку неабходна засяродзіць увагу на сутнасці мастацкай канцэпцыі рэалізму і яго традыцыях у аналітычным, інтэлектуальным рэалізме XX стагоддзя: паглыбленае асэнсаванне быцця, праўдзівае мастацкае ўзнаўленне рэчаіснасці, маральнае завастрэнне пытанняў дабра і зла, праблемы гуманізму [гл., напрыклад, 2]. Настаўнік адзначае, што майстрам аналітычнай прозы ў беларускай літаратуры з'яўляецца В. Быкаў, чые творы вызначаюцца імкненнем да канцэптуальнага аналізу чалавека і свету. На наступных занятках вучні непасрэдна аналізуюць творы пісьменніка ("Сотнікаў", "Знак бяды"), назіраюць за жанрава-стылёвымі асаблівасцямі аповесцей і прыходзяць да высновы, што скандэнсаванасць формы ("лакальная аповесць") – гэта натуральнае выражэнне глыбокага інтэлектуальнага зместу. Спынімся падрабязней на аповесці "Знак бяды".

Аналітыка-рэалістычная аснова аповесцей В. Быкава ў многім паглыбляецца, дзякуючы праблеме маральнага выбару – цэнтральнай у творчасці пісьменніка [гл., напрыклад, 1, 5], якая і робіцца прадметам разгляду на ўроках. Сутнасць работы заключаецца ў наступным: з пазіцый гуманізму ацаніць выбар галоўных герояў аповесці – Петрака і Сцепаніды Багацькаў; вызначыць, як і за кошт чаго паглыбляецца інтэлектуальная аснова твора; ахарактарызаваць рэалістычнасць мастацкага паказу рэчаіснасці. Аптымальны шлях аналізу ў гэтым выпадку – праблемны, які ўяўляе сабой мадэляванне настаўнікам праблемнай сітуацыі, што, у сваю чаргу, вымагае пошуку пытанняў у форме супярэчнасцей, аднак вырашальных для вучняў. У нашым выпадку праблемную сітуацыю можна развіць, аналізуючы пісьменніцкую канцэпцыю свету, пры гэтым настаўнік задае наступнае пытанне: калі свет уладкаваны дрэнна, то як чалавеку, носьбіту дабра, знайсці шлях да шчасця, якім чынам выратаваць гуманістычныя каштоўнасці, які выбар ажыццявіць, якімі метадамі дзейнічаць? – бунт, змаганне ці па прынцыпу "несупраціўленне злу насіллем"? Наколькі ўвогуле апраўдана насілле дзеля дасягнення пэўнай мэты?

Выказванні вучняў сведчаць, што не ўсе старшакласнікі разумеюць маральны выбар Петрака Багацькі – нежаданне апраўдвацца перад людзьмі, абараняцца ад іх, помсціць за недарэчную памылку ў адносінах да сябе. Пры першасным успрыняцці гэтага вобраза вучні

ўяўляюць яго чалавекам з недастатковай воляй і мужнасцю. Вобраз Сцепаніды Багацькі, наадварот, ацэньваецца старшакласнікамі як актыўны. Такім чынам, вучні бачаць пераважна знешнія дзеянні, учынкі герояў і не заўважаюць, што ўнутранае супраціўленне несправядлівасці праз чалавечнасць, духоўную моц з'яўляецца не менш эфектыўным. Гэты памылковы пункт гледжання выпраўляецца настаўнікам не катэгарычна, у форме дакору, а шляхам звароту да класа з пытаннем: "У каго ёсць іншае меркаванне?" Такі падыход дазваляе захаваць пачуццё годнасці вучня, умацаваць у старшакласнікаў перакананне, што памылку можна выправіць. Дэталёвы аналіз тэксту дапамагае школьнікам высветліць, што Пятрок Багацька супрацьстаіць найвялікшай несправядлівасці не насіллем, не помстаю, не бессэнсоўным апраўдваннем, а чалавечнасцю, мерай якой з'яўляецца сумленне, і гэта мае сваё тлумачэнне з пазіцый гуманізму.

На дадзеным этапе ўрока абагульняльнае слова настаўніка падмацоўваецца думкай, што творчасць В. Быкава мае рэалістычны напрамак, развіваецца ў рэчышчы еўрапейскай літаратуры, пры гэтым пісьменнік прапануе свае рэцэпты маральнага выжывання, пазначае шлях да выратавання гуманістычных каштоўнасцей.

Каб глыбей пераканаць вучняў у дакладнасці папярэдніх разважанняў, сфарміраваць больш глыбокія ўяўленні пра аналітычную прозу, а таксама падкрэсліць далучанасць беларускай літаратуры да традыцый сусветнай класікі, праводзяцца паралелі і аналогіі з творчасцю Ф. Дастаеўскага, якім распрацавана мастацкая канцэпцыя асобы і свету з улікам асноўных глабальных ідэй эпохі, актуальных і сёння. Адказы вучняў сведчаць аб стварэнні на ўроку праблемнай сітуацыі: яны неадназначна ўспрымаюць учынкі герояў. Аналізуючы не толькі канкрэтны літаратурны матэрыял, але і жыццёвыя сітуацыі, значная частка вучняў нават пасля высвятлення аналагічных праблем у творчасці В. Быкава і, па сутнасці, насуперак думцы Ф. Дастаеўскага, лічыць, што ў некаторых выпадках бунтарскі шлях з'яўляецца не толькі эфектыўным, але і неабходным. Не прэтэндуючы на абсалютнае вырашэнне праблемы і не выступаючы ў ролі носьбіта абсалютнай ісціны, настаўнік на прыкладзе высокамастацкіх твораў можа паспрабаваць абмеркаваць гэтую версію, паказаць вучням, што ідэя самаўдасканалення асобы, пакорлівасць, несупраціўленне злу насіллем ва ўмовах пастаянных канфліктаў, з якімі сутыкаецца чалавецтва, з'яўляецца сёння як мінімум актуальнай. І калі ўлічваць, што мастацкая літаратура ў яе найлепшых узорах – гэта абагульненне духоўнага вопыту чалавецтва ў вобразнай форме, то ёй можна давяраць і арыентавацца ў жыцці, таму важна зразумець, як менавіта праблема выхаду з неспрыяльнай сацыяльнай сітуацыі вырашаецца ў творчасці Ф. Дастаеўскага і В. Быкава. Каб прывесці вучняў да прыблізна аднолькавага ўспрыняцця (нягледзячы на пэўную рухомасць, усё ж устойлівая сістэма каштоўнасных арыентацый і сэнсу прысутнічае ў творы заўсёды), мэтазгодна спыніцца на наступных момантах:

Па-першае, насілле над злом разбурае асобу чалавека, які змагаецца такімі метадамі. Выкараняючы зло, Раскольнікаў сам становіцца злачынцам, яго бунт не прыносіць выратавання. Сцепаніда Багацька таксама нядоўга адчувае палёгку ад свайго пратэсту (схавала ад немцаў зброю), і першапачатковае маральнае задавальненне хутка перарастае ў адчуванне трагічнай віны, непапраўнай памылкі.

Па-другое, супраціўленне несправядлівасці праз насілле можа прывесці да выпадковых ахвяр, што не суадносіцца з чалавечнасцю. Раскольнікаў вымушаны загубіць нявінную і прыгнечаную душу. Смерць нямога пастушка Янкі, на якога немцы ўскладаюць адказнасць за крадзёж вінтоўкі ("Знак бяды"), таксама ўспрымаецца як жахлівая недарэчнасць. Праблема выпадковасці ахвяр звязана і з тым, што не заўсёды можна дакладна высветліць, хто сапраўды з'яўляецца носьбітам зла, г.зн. узнікае пагроза трагічнай памылкі.

Па-трэцяе, важкім аргументам можа стаць агульны тэзіс пра тое, што немагчыма купіць шчасце ўсяго свету цаной слязінкі дзіцяці. Менавіта на такую думку наводзіць чытача Ф. Дастаеўскі. Аналагічны падтэкст знаходзім і ў творах В. Быкава. Смерць пастушка Янкі (эпізод, згаданы вышэй) здольна азмрочыць настрой не толькі ўскосна вінаватай – Сцепаніды Багацькі, але і радасць усіх людзей, таму што шчасце ўсеагульнае выбудоўваецца з адзінкавага – шчасця асобнага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Паралельная праца з тэкстам рамана Ф. Дастаеўскага яшчэ раз пераконвае вучняў у перавазе і каштоўнасці маральнага выбару Петрака Багацькі, правільнасці яго пазіцыі. Параўнальны аналіз дазваляе прыйсці да высновы, што творчасць В. Быкава адпавядае прынцыпам аналітыка-рэалістычнай прозы, з'яўляецца ўключанай у сусветны "дыялог культур".

Такім чынам, праблемная сітуацыя, якая абмяркоўваецца ў форме дыспуту на матэрыяле творчасці В. Быкава і Ф. Дастаеўскага, спараджае цэлы веер выказванняў і меркаванняў вучняў, часта палярных, але ў рэшце рэшт зведзеных да адзінага паказальніка – выразна акрэсленай і недвухсэнсоўнай думкі пра сцверджанне гуманістычных ідэалаў. Абраны літаратурны матэрыял і пытанні да яго спрыяюць таму, што дыскусія з'яўляецца цікавай, змястоўнай, пазбаўленай дакучлівых сентэнцый, што адпавядае творчаму падыходу да выкладання прадмета.

Эксперыментальная методыка, фрагмент якой пададзены вышэй, пацвярджае, што параўнальнае вывучэнне аналітычнай беларускай і рускай прозы на ўзроўні інтэгратыўных функцыянальных узаемасувязей для старшакласнікаў з'яўляецца хоць і складаным, але даступным і апраўданым, таму што ствараюцца шырокія магчымасці для інтэлектуальнага развіцця вучняў, іх мыслення, выхавання эстэтычнай і духоўнай культуры асобы.

Вывучэнне беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай павышае якасць прэзентацыі навучальнага матэрыялу, спрыяе інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу, забеспячэнню трывалай навуковай асновы ў выкладанні прадмета. У сваёй сістэме працы настаўнік абапіраецца на прыярытэт агульначалавечых каштоўнасцей, улічвае адзінства нацыянальнага і агульначалавечага, арыентуецца на сучасны падыход у выкладанні літаратуры.

**Abstract.** The paper analyses methodological and literary problems of studying V. Bykov's prose in secondary school, viewed from humanistic positions. Comparative context (Dostoevsky) is involved in the investigation.

## Літаратура

1.Афанасьеў, І. Палюбіць чалавецтва: праблемы новага мыслення і новай маралі ў творчасці В. Быкава / І. Афанасьеў // Полымя. – 1998. – № 9. – С.198–208.

2.Борев, Ю. Эстетика: в 2 т. / Ю. Борев. – Смоленск: Русич, 1997. – Т. 2: Эстетика. – С.257 – 281, 475–494.

3.Івашын, В. З пазіцый гуманізму: тэарэтыка-метадалагічныя і метадычныя праблемы літаратурнай адукацыі / В. Івашын. – Мінск, 1998. – 165 с.

4.Лазарук, М. Навучанне літаратуры як творчасць / М. Лазарук // Полымя. – 1983. – № 10. – С. 200–217.

5.Тычына, М. В. Быкаў і мы / М. Тычына // Полымя. – 1994. – № 6. – С.207–219.

Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт Поступило 26.11.07

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ